Ученые записки • Общественные и гуманитарные науки • Педагогика
Том 1 • 2002

УДК 37.032

# Тэарэтычныя асновы праблемы маральнага самавызначэння школьнікаў

**У.В. Пашкевіч**

Патрэбнасць і здольнасць асобы да маральнага самавызначэння ў многім абумоўлена ўзроўнем развіцця грамадства. На працягу працяглага часу для нашай сістэмы адукацыі і выхавання была (і застаецца) характэрна дырэктыўная педагогіка з жорсткімі ўстаноўкамі на прытрымліванне норм, прадпісанняў, інструкцый, на змяншэнне актыўнай пазіцыі асобы школьніка, творчага пачатку ў засваенні маральных норм і каштоўнасцей. Прынцып уздзеяння і па сённяшні дзень з'яўляецца дамінуючым у адносінах дарослых і дзяцей, настаўнікаў і вучняў. Зразумела, што такі падыход не дастаткова ўлічвае асаблівасці, структуру і змест самаразвіцця і самавызначэння школьніка, заканамернасцей гэтага развіцця, прыводзіць не да развіцця пазітыўнай матывацыі ўчынкаў, а да карыслівасці, пасіўнасці, спажывецкай пазіцыі. У гэтых умовах набывае надзвычайную актыўнасць прынцып самавызначэння асобы, які павінен прыйсці на змену прынцыпу яе жорсткага рэгламентавання.

Нормай для новай школы становіцца магчымасць выбару новых варыятыўных праграм, падручнікаў, тэхналогій навучання і выхавання. Усё гэта стварае толькі стартавыя магчымасці для працэсу самавызначэння школьнікаў. Разам з тым, асоба можа рэалізаваць свае здольнасці самавызначыцца, а можа не рэалізаваць і існаваць, кіруючыся інстынктамі і набытымі ва ўласным вопыце ўменнямі і навыкамі.

У айчыннай, а таксама зарубежнай філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі, педагогіцы не так шмат спецыяльных работ, прысвечаных вывучэнню праблемы маральнага самавызначэння. Нягледзячы на частае выкарыстанне гэтага тэрміна, паняцце «маральнае самавызначэнне» яшчэ недастаткова вызначана, не ў поўнай меры інтэрпрэтаваны з'явы, якія ўплываюць на станаўленне і фарміраванне маральнага самавызначэння асобы.

У тлумачальным слоўніку беларускай мовы «самавызначэнне» трактуецца як дзеянне ад дзеяслова «самавызначацца», што азначае ўсведамляць сябе, свае класавыя і грамадскія інтарэсы, вызначыць сваё ўласнае існаванне, сваё месца ў жыцці, у грамадстве [1].

У філасофіі самавызначэнне разглядаецца як «імкненне ўстанавіць свой кантынуум самарэалізацыі і яго сэнс» [2], пры гэтым пад «імкненнем» разумеецца і патрэбнасць у самарэалізацыі, і воля да яе, і сам працэс устанаўлення кантыніума самарэалізацыі і яго сэнсу, вызначэнне сябе як істоты, якая валодае свядомасцю і воляй.

З этычнага пункту гледжання самавызначэнне разглядаецца як адна з важнейшых маральных каштоўнасцей, каштоўнасцей чалавечага жыцця (Аўгусцін, М. Бубер, У. Джэймс, Н. Лоскі, Дж. Мур, У. Салаўёў, П.Ф. Ларэнскі, С. Франк і інш.).

Пытанням самавызначэння, самаўдасканалення асобы вялікая ўвага надавалася ўжо ў этыцы старажытнай Грэцыі і Рыма, філасофскіх сістэмах Усходу, філасофскай і рэлігійнай маралістыцы Ветхага і Новага Запаветаў. І няхай у гэтыя, як і ў больш познія часы, сам тэрмін «самавызначэнне» не ўжываецца, тым не менш, накіраванасць этычнага мыслення на вызначаную намі праблему можна ўжо ўбачыць у вучэнні сафістаў, Дэмакрыта, Сакрата.

Свабода маральнага самавызначэння ляжыць у аснове і хрысціянскага вучэння. Само паняцце свабоды ў хрысціянстве – гэта магчымасць рэалізацыі росту асобы ў межах, вызначаных Богам магчымасцей. Згодна вучэння, здзяйсняючы здольнасць маральнай арыентацыі ў вобласці сэнсаў і каштоўнасцей, чалавек свядома і свабодна робіць кожны маральны выбар. Платон (Ігумнаў) бачыць задачу духоўна-маральнага самавызначэння чалавека ў пераходзе ад свету пачуццёвага да звыш пачуццёвага, ад свету рэальнага да ідэальнага [3]. Арыентацыя чалавека на свет рэальны, пачуццёвы вядзе, на думку хрысціянскага даследчыка, да застою, арыентацыя ж на ідэальны свет гэту тэндэнцыю выключае. «Сутнасць маральнага самавызначэння заключаецца ў тым, якая арыентацыя ў асабістым жыцці чалавека пераважыць» [3, с. 108]. У чалавека заўсёды ёсць права і магчымасць рэальнага маральнага выбару.

Сутнасць маральнага самавызначэння вучоныя разглядаюць ў рэчышчы катэгорыі маральнай адказнасці. Маральная адказнасць жа, у сваю чаргу, адлюстроўваецца ў паняцці «абавязак», якое вызначае самаабавязванне – цэнтральнае звяно маральнага самавызначэння. Увогуле пра маральнае самавызначэнне можна гаварыць толькі тады, калі маральнае «я» аб'ектывізуецца ў рэальных паводзінах суб'екта, іншымі словамі пры «адзінстве маральнай свядомасці і паводзін» [4, с. 45]. Пры гэтым, перад выхаваўчымі інстанцыямі стаіць задача – «узняць маральную свядомасць суб'екта да такой ступені дасканаласці, якая забяспечвае ўстойлівую паводзінскую рэалізацыю норм індывідам» [4].

Даследчык А.Г. Драбніцкі лічыць, што маральнае самавызначэнне – гэта не проста прытрымліванне прынятых ў грамадстве нормаў, а замацаванне таго, што павінна быць. Як і іншыя даследчыкі, вучоны сцвярджае думку, што маральная адказнасць з'яўляецца сістэмаўтвараючай уласцівасцю маральнага самавызначэння.

Д.Ж. Валееў [5] разглядае маральнае самавызначэнне як адну з важнейшых характарыстак сацыялізацыі. Ён бачыць фарміраванне маральнай асобы як канечную мэту этычнай асветы, а маральнае самавызначэнне – як паказчык гэтага працэсу, а таксама тое, у якой ступені асоба зольна самастойна здзяйсняць маральны выбар [5, с. 131]. Нельга пагадзіцца і з думкай К.А. Абульканавай-Слаўскай, якая лічыць, што «маральнае самавызначэнне не складаецца з асобных маральных рашэнняў, выбараў, учынкаў, як гэта часцей за ўсё ўяўляюць, а менавіта ў выпрацоўцы патрэбнасці ва ўзвышана-духоўным жыцці» [6].

Самавызначэнне ў агульнапаводзінскім значэнні разглядаецца і ў псіхалогіі. У апошнія дзесяцігоддзі псіхалагічная навука ўсе часцей і часцей стала звяртацца да феномену самавызначэння, хаця трэба прызнаць, што колькасць прац, у якіх разглядаюцца ўласна псіхалагічныя механізмы самавызначэння, невялікая.

Цікавасць да дадзенай праблемы тлумачыцца не толькі жаданнем пазнаць адну з важнейшых характарыстак асобы, якая жыве ў час пераацэнкі каштоўнасцей, але і выявіць так важны сёння механізм фарміравання чалавека суверэннага, самастойнага.

У псіхалагічным слоўніку пад рэд.А.У. Пятроўскага і М.Г. Ярашэўскага чытаем: «Самавызначэнне асобы – свядомы акт выяўлення і сцвярджэння ўласнай пазіцыі ў праблемных сітуацыях [7].

К.А. Абульханава-Слаўская лічыць, што самавызначэнне – гэта ўсведамленне асобаю сваёй пазіцыі, якая сфарміравалася ўнутры каардынат сістэмы адносін [6, с. 155].

І.С. Кон разглядае самавызначэнне ў рамках сацыяльнай і грамадзянскай сталасці. Ён звязвае самавызначэнне з выбарам сацыяльна і асобасна значных мэтаў, дасягненне якіх забяспечвацца самарэалізацыяй суб'екта [8].

Асоба, якая самавызначаецца, згодна В.Ф. Сафіна, – гэта сацыяльна сталы чалавек, што валодае высокім узроўнем развіцця інтэлекту, фізічных сіл, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для сацыяльна накіраванай жыццядзейнасці. У псіхалагічным аспекце такая асоба ўсведамляе свае мэты, жыццёвыя планы, асобасныя і фізічныя ўласцівасці, тое, што ад яе чакае калектыў (грамадства) [9]. У гэтым плане самавызначэнне разглядаецца як цэнтральны механізм станаўлення асобаснай сталасці, сутнасць якога ва ўсвядомленым выбары чалавекам свайго месца ў сістэме шматбаковых сацыяльных адносін. З'яўленне патрэбнасці ў самавызначэнні сведчыць пра дасягненне асобай даволі высокага ўзроўню развіцця, для якога характэрна імкненне заняць уласную, дастаткова незалежную пазіцыю ў структуры інфармацыйных, ідэалагічных, прафесійных, эмацыянальных і другіх сувязей з іншымі людзьмі.

Працэс станаўлення чалавека як грамадскай істоты характарызуецца дыялектычным спалучэннем імкнення да адзінства, грамадскаму прызнанню, уключэнню ў сацыяльную агульнасць і да адасаблення, вылучэнню з агульнасці ў якасці самакаштоўнага індывіда (індывідуалізацыя). На ранніх этапах развіцця дзіцяці цэнтральным механізмам станаўлення яго свядомасці выступае далучэнне да культурнагістарычнага, маральнага вопыту чалавецтва. Фарміраванне жыццёвых навыкаў, мовы, мысленчых аперацый здзяйсняецца ў цеснай узаемасувязі з носьбітам вопыта - дарослым, якое выступае накіроўваючай і рэгулюючай сілай у гэтым працэсе. Засваенне маральнага вопыту адбываецца за кошт падражання, пазней – пасродкам сумесных, кааператыўных дзеянняў. Падначаленае становішча дзіцяці на гэтым этапе натуральна і заканамерна. Толькі паступова дзіця набывае здольнасць дзейнічаць самастойна, што выступае галоўнай перадумовай фарміравання самасвядомасці. На гэтай аснове па меры ўзроставага развіцця фарміруюцца ўсвядомленыя выбарныя адносіны да знешніх абставін, маральных каштоўнасцей. Дзіця ўжо ў стане прымаць адны ўплывы і адмаўляць другія не проста на аснове элементарных імкненняў ці настрою, але на аснове свядомых ацэнак, ідэалаў, перакананняў.

Псіхолагі разглядаюць самавызначэнне і як працэс засваення чалавекам розных сацыяльных ролей, адны з якіх ён прымае, другія – адмаўляе; адны паспяхова засвойвае, тады як выкананне другіх у яго не атрымліваецца. У гэтым працэсе рашаючае значэнне належыць педагагічнаму ўплыву, так як менавіта ад яго належыць выбар ролей і іх адэкватнае засваенне. Упушчэнні ў выхаваўчым працэсе прыводзяць

да таго, што сталеючы, чалавек не можа паўнацэнна выконваць сацыяльна значныя ролі, здзяйсняць маральны выбар і па-гэтаму аддае перавагу тым, засваенне якіх не звязана з інтэлектуальнымі і маральнымі намаганнямі. Паўнацэннага самавызначэння ў такіх выпадках не адбываецца, гэта значыць, перавага аддаецца канформнаму падражанню прымітыўным узорам. Вынікам гэтага з'яўляецца пасіўнасць, маральны інфантылізм, дэвіянтныя паводзіны. Нягледзячы на тое, што дзіця дэманструе здольнасць да самастойных дзеянняў і рашэнняў ужо на трэцім годзе жыцця, гэта яшчэ не сведчыць пра яго самавызначэнне, так як спробы сцвердзіць сваю пазіцыю носяць пераважна эмацыянальны, а не мэтанакіраваны ўсвядомлены характар. Сапраўднае самавызначэнне здзяйсняецца ў старэйшым падлеткавым і юнацкім узросце, калі ўжо назапашаны вядомы вопыт, які дазваляе здзяйсняць прадуманы і абгрунтаваны выбар. У гэтым узросце становіцца магчымым сапраўднае самасцвярджэнне, якое з'яўляецца важным кампанентам самавызначэння. Уласную пазіцыю неабходна не толькі выбраць, але і адстаяць, гэта значыць уласнымі паводзінамі сцвердзіць сваю адпаведнасць ёй. Гэта патрабуе пэўнай падрыхтаванасці матывацыйнай сферы, якая фарміруецца на працягу дзяцінства пад рашаючым уплывам выхавання [10].

Неабходнай прыкметай самавызначэння псіхолагі называюць «рух у бок утварэння самастойнасці: **сама**-ўсведамляючага, **сама**-мэтанакіраванага (індывідуалізаванага) суб'екта, які здольны з некаторага моманту да самаразвіцця» [11].

Маральнае самавызначэнне асобы цесна звязана з далучэннем яе да маральных каштоўнасцей, так як маральная каштоўнасць – гэта адзін з механізмаў узаемадзеяння асобы і грамадства. Адсюль пад самавызначэннем разумеецца вызначэнне сябе (самавызначэнне, актыўная пазіцыя) адносна соцыякультурных каштоўнасцей, і тым самым – вызначэнне сэнсу свайго існавання. Вызначэнне сябе як асобы мае каштоўнасна-сэнсавую прыроду, актыўнае вызначэнне сваёй пазіцыі адносна грамадска выпрацаванай сістэмы каштоўнасцей [12].

Маральныя каштоўнасці асобы, яе маральныя каштоўнасныя арыентацыі – дэтэрмінанты паводзін асобы, яны непасрэдным чынам уплываюць на маральны выбар. Агульначалавечыя маральныя нормы, што пануюць у грамадстве, могуць быць аб'ектам выбару асобы толькі таму, што яны падмацоўваюцца сістэмай грамадскіх, сацыяльных санкцый. У гэтым выпадку цяжка гаварыць пра асобу, як пра асобу, што самавызначаецца. Іншая справа, калі маральныя нормы грамадства становяцца для асобы каштоўнымі, гэта значыць, задавальняючымі патрэбнасці. Тады яны выступаюць як эталон не проста неабходнага, але і пажаданага. Гэтыя развагі прыводзяць нас да высновы, што праблему самавызначэння школьнікаў мэтазгодна разглядаць у ракурсе аксіялагічнага падыходу.

Гэты шлях апраўданы яшчэ і тым, што ў псіхалагічных даследаваннях маральнага самавызначэння вялікае значэнне надаецца маральнаму ідэалу як інтэгрыруючаму пачатку. А як вядома, маральны ідэал з'яўляецца адной з форм маральных каштоўнасцей. Даследаванні, праведзеныя пад кіраўніцтвам Л.І. Бажовіч [13] паказалі, што ў маральным самавызначэнні ідэал, з аднаго боку, стварае больш або менш пастаянную і інтэнсіўную сістэму маральных памкненняў, а з другога – з'яўляецца маральным крытэрыем учынкаў чалавека ў розных жыццёвых сітуацыях. Меnавіта

сфарміраваны ідэал выступае рэгулятарам паводзін. Таму невыпадкова сёння педагагічная думка актыўна шукае новыя шляхі маральнага ўдасканалення вучняў на аснове аксіялагічнага падыходу. Асноўныя педагагічныя падставы фарміравання асобы школьніка – уключэнне яе ў сітуацыю выбару каштоўнасцей, іх асэнсаванне, маральна-матывіраваныя адносіны, дапамога ў ацэнцы і самаацэнцы сваіх дзеянняў, учынкаў. Сучасная парадыгма выхавання прадугледжвае не навязванне тых ці іншых каштоўнасцей, а стварэнне неабходных умоў для іх пазнання, разумення і выбару, стымуляцыю гэтага выбару і далейшую ўнутраную працу школьніка над сваімі ўчынкамі і дзеяннямі.

Важная задача школы сёння – стварэнне спрыяльных умоў для маральнага ста-лення і самавызначэння вучняў, што, у сваю чаргу, абумоўлівае пазнанне педагагічнай сутнасці і механізму працэсу маральнага самавызначэння.

У педагагічнай літаратуры маральнае самавызначэнне часцей за ўсе разглядаецца як вызначэнне свайго маральнага ідэалу і маральных прынцыпаў яе асноўных рэгулятараў сваіх учынкаў і жыццядзейнасці ў цэлым, усведамленне сябе як захавальніка і носьбіта маральных каштоўнасцей. Такі падыход падаецца нам крыху спрошчаным, які не ў поўнай ступені раскрывае сутнасці пытання ў кантэксце праблемы самавызначэння ў цэлым. Мы разглядаем ***маральнае самавызначэнне школьнікаў як фенамен, які мае каштоўнасна-сэнсавую аснову і грунтуецца на свядомым і адказным маральным выбары і суаднясенні яго з патрабаваннямі маралі, вызначэнні адносін да каштоўнасцей грамадства і ўласных каштоўнасцей, шляхоў маральнай самарэалізацыі.***

Мы зыходзім з той пазіцыі, што праблема маральнага самавызначэння школьнікаў можа вывучацца і вырашацца праз аксіялагічны кантэкст. Які маральны выбар зробіць школьнік, залежыць ад сістэмы яго маральных каштоўнасных арыентацый, маральных каштоўнасцей і асяродку, у якім ён існуе.

Як адбываецца працэс маральнага самавызначэння? У сваіх меркаваннях мы зыходзім з таго, што працэс маральнага самавызначэння, па-першае, самастойны, як аб'ект даследавання, ад самавызначэння, па-другое, ён з'яўляецца неад'емнай часткай і асновай, на якой грунтуюцца іншыя віды самавызначэння, у першую чаргу жыццёвае, прафесійнае, сацыяльнае і іншыя, па-трэцяе, працэс маральнага самавызначэння працякае на працягу ўсяго жыцця, ён можа актывізавацца, пераходзіць на больш высокі ўзровень на пэўных этапах развіцця асобы школьніка.

Адзначым і той немалаважны факт, што працэс маральнага самавызначэння не можа здзяйсняцца без аналізу ацэнкі школьнікам сваіх маральных магчымасцей, здольнасцей, схільнасцей, інтарэсаў, мэтавых установак, маральных якасцей і каштоўнасцей, ідэалаў; ён працякае пад уплывам многіх як унутраных, так і знешніх фактараў.

У сваю чаргу, працэс маральнага самавызначэння мае свае ўнутраныя этапы фарміравання і развіцця [14].

Ненаданне належнай увагі педагагічнай падтрымцы працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў, а таксама няведанне фактараў (умоў) эфектыўнага развіцця маральнага самавызначэння школьнікаў можа прывесці да маральнага інфантылізму, што выражаецца ў няздольнасці на самастойны маральны выбар, несфарміраванасці

сістэмы маральных каштоўнасцей, адсутнасці дакладна выражанай лініі паводзін. Пры гэтым, дадзенае становішча можа поўнасцю задавальняць школьніка, а потым і дарослага чалавека. Прыстасавальніцтва да абставін жыцця, абвінавачванне ўсіх акаляючых акрамя сябе ў сітуацыі няўдачы становяцца нормай для асобы, нягледзячы на тое, што ставяць яе ў пастаяннае залежнае становішча.

Мы лічым, што можна вылучыць наступныя ўтвараючыя дадзенага паняцця: маральныя веды (веды маральных катэгорый і маральных прынцыпаў), матывы паводзін, маральная самаацэнка, атрыманая асобай на аснове самапазнання, маральныя каштоўнасныя арыентацыі.

Зыходзячы са зробленага намі вываду, ***механізм працэсу маральнага самавызначэння школьніка мы бачым у пазнанні і прыняцці маральных каштоўнасцей грамадства праз маральны выбар, ідэнтэфікацыю, самапазнанне і фарміраванне на гэтай аснове маральных каштоўнасных арыентацый, духоўнай самакаштоўнасці, здольнасці самастойна выпрацоўваць маральныя прынцыпы і кіравацца імі ў сваім паводзінах.***

Даследуючы праблему маральнага самавызначэння, вучоныя вялікую ўвагу надаюць пытанню: хто самавызначаецца? Цэнтрам увагі пры разглядзе дадзенага пытання становіцца паняцце «суб'ект».

Суб'ект – гэта дзеяч у шырокім сэнсе, гэта вытворца, стваральнік не толькі знешняга, але і ўсяго ўнутранага, у тым ліку і самасвядомасці (С.Л. Рубінштэйн).

Канцэпцыя суб'екта дае магчымасць ставіць у цэнтр увагі ідэю аб індывідуальна актыўным чалавеку, які можа, умее будаваць умовы жыцця і свае адносіны да іх. Чалавек становіцца суб'ектам свайго жыцця, калі ён можа выпрацоўваць спосаб рашэння жыццёвых супярэчнасцей, усведамляць сваю адказнасць перад сабой і людзьмі за вынікі свайго рашэння.

На працягу доўгіх гадоў у нашым грамадстве практыкавалася аднабаковая сувязь індывіда і грамадства. Грамадства аўтарытарна ўздзейнічала на асобу, бачыла ў ёй толькі аб'ект уздзеяння. Выбар, маральны ў тым ліку, быў абмежаваны жорсткімі рамкамі, выхад за якія не менш жорстка караўся, нараджаў пачуццё страху і непаўнацэннасці. У выніку чалавек як суб'ект не можа развівацца, працэс маральнага самавызначэння замаруджваецца. Невыпадкова, што пры такой вялікай колькасці літаратуры па маральным выхаванні, распрацаваных выхаваўчых сістэмах, у нашым грамадстве застаецца так шмат маральна інфантыльных людзей. Станаўленне суб'екта маральнага самавызначэння залежыць ад таго, наколькі ўсвядомлена школьнік прымае грамадскую мараль як сваю ўласную мэту, уключаецца ў дзейнасць па рэалізацыі гэтай мэты. А гэта, у сваю чаргу, залежыць ад таго, як пабудаваны выхаваўчы працэс, ці ўяўляе ён сабой працэс сутворчасці, разумення і стварэння маральных каштоўнасцей у ходзе сумеснай дзейнасці выхаваўцеля і выхаванцаў як раўнапраўных суб'ектаў.

Далёка не кожны чалавек можа стаць маральным суб'ектам свайго жыцця, яшчэ больш складана гэтага дасягнуць школьніку, так як умовы жыцця нашага сённяшняга грамадства, калічнасці ўласнага жыцця ўсе часцей і часцей супярэчаць магчымасцям і здольнасцям дзіцяці. У той жа час змены, што адбываюцца ў грамадстве, ствараюць умовы, калі дабрабыт канкрэтнага чалавека залежыць у першую чаргу ад яго самога,

падштурхоўваюць кожнага чалавека, у тым ліку і школьніка, да прынящця рашэнняў па жыццёвых і найперш маральных праблемах. Толькі тая асоба, якая здольна прымаць рашэнні і выконваць іх, несці за іх адказнасць, можа прэтэндаваць на тое, каб стаць маральным суб'ектам жыцця.

Зразумела, што маральны суб'ект не можа зводзіцца толькі да здольнасці маральнага выбару, маральнай дзейнасці, свядомасці, самасвядомасці. Ён павінен уключыць у сябе маральныя якасці, набытыя і набываемыя ў працэсе дзейнасці. Няведанне законаў псіхічнага і маральнага развіцця дзіцяці гэтага ўзросту бацькамі прыводзіць іншы раз да празмернай апекі, забарон праяўлення ўласнай ініцыятывы, свабоды дзеяння, што ніякім чынам не садзейнічае яго фарміраванню як суб'екта. І наадварот, разуменне таго, што ў дзіцячым узросце ідзе закладка ў псіхіцы дзіцяці вобраза сябе, разуменне заканамерных няўдач і памылак, падтрымка і заахвочванне поспехаў садзейнічаюць развіццю ў дзіцяці самастойнасці, упэўненасці ў сабе, аптымістычнага погляду на свет.

Ужо ў малодшым школьным узросце ў дзяцей фарміруецца пэўнае разуменне і ацэнка сацыяльных з'яў, арыентацыя на ацэначныя адносіны дарослых праз вынікі пэўнай дзейнасці. Адбываецца развіццё рэфлексіі як новаўтварэння гэтага ўзросту. У дзіцяці з'яўляецца жаданне выказаць свой погляд, ацаніць учынак, выбраць каштоўнасць. Праўда, праяўляецца гэта перш за ўсе праз вучэбную дзейнасць, што падкрэслівае важную ролю настаўніка ў станаўленні школьніка як маральнага суб'екта.

Зразумела, што адной з асноўных умоў станаўлення школьніка як суб'екта маральнага самавызначэння з'яўляецца фарміраванне адэкватнай самаацэнкі вучняў, якая праяўляецца ў самастойнасці, актыўнасці, знаходлівасці школьнікаў.

Поспех працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў і станаўлення іх як суб'ектаў жыцця залежыць і ад узроўню развіцця волі, здольнасці не палохацца жыццёвых цяжкасцей. Ва ўмовах сённяшняга жыцця самарэалізавацца, дасягнуць пэўных вяршынь у жыцці, забяспечыць сваю эканамічную самастойнасць мае магчымасць толькі асоба настойлівая, мэтанакіраваная і валявая.

Важнае значэнне ў станаўленні дзіцяці як маральнага суб'екта мае развіццё яго пачуццёва-эмацыянальнай сферы. Эмацыянальнае жыццё малодшага школьніка надзвычай насычанае. Вучань эмацыянальна перажывае новыя знаёмствы з людзьмі рэальнымі і мастацкімі вобразамі. Эмацыянальныя перажыванні узнікаюць ад усведамлення пазнанага. Самі маральныя пачуцці становяцца больш асэнсаванымі і глыбокімі.

Надзвычай важным этапам у станаўленні школьніка як маральнага суб'екта з'яўляецца падлеткавы перыяд.

Псіхолагі адзначаюць, што менавіта ў падлеткавым узросце працэс фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый, станаўлення яго як суб'екта працякае найбольш эфектыўна. Як зазначае даследчыца Р.І. Цвяткова: «У гэты перыяд антагенетычнага развіцця ўзнікаюць найбольш спрыяльныя ўмовы, што ўключаюць у сябе новы ўзровень самаўсведамлення, самаацэнкі, імкненне да самастойнасці і самавыхавання. Гэта новаўтварэнне садзейнічае ўсведамленню глыбокага маральнага сэнсу іх учынкаў і фарміраванню, пры мэтанакіраваным працэсе арганізацыі вопыту, устойлівых маральных каштоўнасцей. Асоба падлетка пачынае набываць такі ўзровень псіхічнага развіцця, які робіць яго здольным кіраваць сваімі паводзінамі і дзейнасцю» [15].

Менавіта ў падлеткавым узросце адбываецца інтэнсіўнае маральнае фарміраванне асобы, авалодванне маральна-этычнымі нормамі паводзін. У гэты перыяд вучань пачынае шырока карыстацца сістэмай ацэначных меркаванняў. Таму характар маральна-каштоўнасных арыентацый асобы ў падлеткавым узросце вызначаецца ўзроўнем сфарміраванасці самаацэнкі ў працэсе назапашвання маральнага вопыту, які падлетак набыў у працэсе маральнай дзейнасці або пры ацэнцы маральных аспектаў дзейнасці ўвогуле. Менавіта ў школьнікаў падлеткавага ўзросту пачынаюць фарміравацца свае ўласныя маральныя каштоўнасныя арыентацыі, якія пры мэтанакіраваным уздзеянні з боку настаўніка, выхавацеля, бацькоў пашыраюцца, уключаючы ў сябе паступова ўсё новыя і новыя маральныя нормы. Разам з тым, пэўныя маральныя нормы, патрабаванні падлеткам не ўспрымаюцца. Яго ацэнкі, погляды, перакананні не такія ўстойлівыя, як у дарослага чалавека або школьніка старэйшых класаў. Яны яшчэ не складаюць адзіную цэласную сістэму. У сувязі з гэтым падлеткі могуць лёгка падпасці пад уплыў з боку іншай асобы, змяняецца дынаміка іх маральных ідэалаў. Гэтым тлумачыцца і той факт, што некалі прыкладны выхаванец набывае менавіта ў падлеткавым узросце адмоўныя маральныя якасці, культывуе іх, лічыць іх маральна каштоўнаснымі.

Пераадоленне падлеткам супярэчнасцей паміж іх фізіялагічнымі, маральнымі, інтэлектуальнымі магчымасцямі і патрэбнасцямі спрыяе станаўленню яго як маральнага суб'екта жыцця, пераходу яго на больш высокі ўзровень маральнага развіцця. Вызначальнымі характарыстыкамі школьніка-падлетка як маральнага суб'екта з'яўляюцца крытычныя адносіны да сябе, наяўнасць жыццёвай мэты, адэкватная самаацэнка сваіх здольнасцей, патрэбнасцей, магчымасцей іх задавальнення, імкненне да самасцвярджэння ў грамадска патрэбным відзе дзейнасці, самаўдасканаленні; актыўная дзейнасць, накіраваная на ўзбагачэнне ўзроўню маральнай самасвядомасці, задавальнення духоўных патрэбнасцей.

У старэйшым школьным узросце адбываецца якасны скачок у развіцці самасвядомасці. Школьнік знаходзіцца напярэдадні ўступлення ў самастойнае жыццё, якое запатрабуе ад яго вызначэння адносін да жыццёвых рэалій, асабістай лініі паводзін, адказнасці за прынятыя рашэнні. Усе гэта стварае патрэбнасць у старша-класнікаў у маральным самавызначэнні. Вучні гэтага ўзросту пастаянна ацэньваюць і выбіраюць жыццёвую мэту, будучую прафесію, важнасць і неабходнасць таго ці іншага віду дзейнасці ў школе і па-за ей з улікам спецыфікі будучай прафесіі, стыль паводзін і г.д. У гэты час актыўна выпрацоўваюцца асабістыя маральныя пазіцыі, фарміруюцца маральны ідэал, маральныя каштоўнасныя арыентацыі. Старшакласнікі імкнуцца пазнаць сябе, даць сабе адэкватную самаацэнку, правільна ацаніць тых, хто побач, герояў мастацкіх твораў. Менавіта для іх «становіцца магчымым пазнанне і ацэнка такой складанай з'явы, якой з'яўляецца маральна-псіхалагічны воблік чалавека. З развіццём маральнай самасвядомасці ў старшакласнікаў з'яўляецца асобы інтарэс да ўнутранага свету акаляючых людзей і свайго ўласнага, узнікае патрэбнасць разабрацца не толькі ў асаблівасцях асобы другога чалавека, але і ў сваіх уласных, зрабіць справаздачу ў сваіх перажываннях, ацаніць свае магчымасці ў маральным удасканаленні» [16, с. 18].

Асаблівасцю дадзенага ўзросту з'яўляецца і тое, што вучні ўжо ў стане не толькі ацаніць свае магчымасці ў маральным удасканаленні, але і самастойна ўдасканальваць

свае паводзіны, знаходзіць шляхі самавыхавання. У гэты час ідзе актыўнае станаўленне старшакласніка як маральнага суб'екта: інтэнсіўная вучэбная дзейнасць спрыяе фарміраванню светапогляду вучняў, веды ператвараюцца ў ідэалы, садзейнічаюць актыўнасці асобы; адбываецца ідэнтэфікацыя сябе як будучага прадстаўніка пэўнай прафесіі з маральным воблікам лепшых людзей выбранай прафесіі; узрастае імкненне сцвердзіць уласную індывідуальнасць.

Неабходна зазначыць, што ўнутраныя перадумовы станаўлення працэсу маральнага самавызначэння старшакласнікаў, фарміравання іх як суб'ектаў маральнай дзейнасці ў гэтым узросце намнога багацейшыя, чым іх рэальная рэалізацыя. Канстатацыя дадзенага факта прыводзіць да думкі, што дадзенай праблеме не надаецца належная ўвага ў практыцы выхавання, якасць педагагічнай падтрымкі працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў жадае быць лепшай, у педагагічнай тэорыі недастаткова распрацаваны і вызначаны шляхі, ўмовы эфектыўнасці працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў.

Імкненне да маральнага самавызначэння – імкненне да вышэйшага ўзроўню развіцця. Мы лічым, што ***састаўляючыя маральнага самавызначэння*** наступныя:

– усведамленне асобаю сябе як непасрэдна суб'екта маральнай дзейнасці;
– веданне сваіх маральных магчымасцей і адэкватная маральная самаацэнка;
– здольнасць да маральнага выбару;
– наяўнасць маральнай актыўнасці і адказнасці;
– устойлівае імкненне да маральнай самарэалізацыі.

Дзеля правільнай арганізацыі работы са школьнікамі па вырашэнні праблемы маральнага самавызначэння, лічым неабходным вылучыць умовы, якія эфектыўна ўплываюць на дадзены працэс.

Прыярытэтнай умовай эфектыўнасці працэсу маральнага самавызначэння мы лічым фарміраванне ў школьнікаў маральных каштоўнасных арыентацый.

У маральным самавызначэнні асобы надзвычай важнае значэнне набывае працэс самапазнання. У гэтай сувязі задачай школы, выхавацеляў, бацькоў становіцца стварэнне ўмоў для самапазнання. Дзіця мае права на пошук сябе на ўроку, у пазакласнай дзейнасці. Жаданне дзіцяці паспрабаваць сябе на спартыўнай пляцоўцы, у тэхнічным гуртку, на сцэне і г.д. і выбраць адпавядаючае ўласнай сутнасці – здаровае жаданне, адпавядаючае псіхічнай сутнасці патрэбнасць. Далучэнне да маральных каштоўнасцей, фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый, а гэта значыць, і маральнае самавызначэнне можа адбывацца толькі праз выбраную і палюбіўшуюся самому дзіцяці дзейнасць.

У працэсе самапазнання фарміруецца маральная самаацэнка вучня, развіваецца здольнасць да ацэньвання, аб'ектыўнага выбару. Разуменне таго, што чалавек – гэта асобны, непадобны на іншых індывід пачынае фарміравацца ў раннім дзяцінстве, і на працягу ўсяго жыцця самаацэнка і звязаныя з ей ацэначныя здольнасці таксама фарміруюцца і развіваюцца.

Наступная ўмова станаўлення маральнага самавызначэння школьнікаў – развіццё ў іх самастойнасці і актыўнасці, фарміраванне маральнай адказнасці.

Без маральнай адказнасці не можа быць і свабоднага маральнага выбару. Многія філосафы, псіхолагі, якія займаліся праблемай адказнасці і маральнага выбару асобы (Э.

Фром, А. Маслоу, В. Франкл і інш.) выказвалі думку, што жыццё чалавека – гэта цэлая серыя, ланцужок маральных выбараў: увесці ў зман ці быць чэсным, украсці ці не ўкрасці ў кожным канкрэтным выпадку, прычым кожны раз павінен быць зроблены выбар, які вядзе да росту (А. Маслоу). Для асобы, якая дасягнула пэўных вышынь маральнага самавызначэння праблема маральнага выбару не стаіць так востра, бо для яе выбар перастае быць надзённай праблемай, паколькі асоба ўжо выбрала свой жыццёвы шлях, знайшла сябе. Пакуль жа вучань штодзённа трапляе ў абставіны, якія прымушаюць рабіць выбар. Ужо добра, калі перад школьнікам паўстае выбар, гэта значыць, калі вучань разумее, усведамляе розныя варыянты маральнага дзеяння. Значна горш, калі дылема не ўзнікае, а свядомасць заснавана на адным варыянце: «Свая рубашка бліжэй да цела».

Маральны выбар не будзе пастаяннай праблемай школьніка, калі настаўнікі, бацькі змогуць спецыяльна ствараць маральныя сітуацыі, каб быць побач, калі ствараецца праблема маральнага выбару, замацаваць у школьніка маральна-каштоўнасныя спосабы паводзін.

На нашу думку, важнай умовай станаўлення і развіцця працэсу маральнага самавызначэння з'яўляецца ўлік полавай прыналежнасці. А. Маслоу сцвярджае, што самаактуалізацыя не з'яўляецца абсалютна агульным паняццем [17]. Дарога да яе ляжыць праз рэалізацыю мужчынскіх і жаночых якасцей, якія мацнейшыя, чым агульначалавечыя якасці. Згодна А. Маслоу, чалавечая істота павінна спачатку стаць сапраўднай жанчынай ці сапраўдным мужчынам, тым самым ствараючы магчымасці для самаактуалізацыі ў агульнапаводзінскім сэнсе.

Станаўленне школьнікаў як маральных суб'ектаў, здольных да маральнага самавызначэння ў многім залежыць ад зместу і метадаў па арганізацыі вучэбнай, пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці, ад правільна арганізаванай педагагічнай падтрымкі дадзенага працэсу. У час, калі яшчэ на падсвядомым узроўні вучні пачынаюць ставіць задачы самаразвіцця, шукаюць сродкі іх вырашэння, побач павінен быць вопытны педагог, дапамога якога будзе так неабходна ў зоне бліжэйшага развіцця новаўтварэння вучня. Веданне настаўнікам сутнасці працэсу маральнага самавызначэння, умоў яго эфектыўнасці дасць магчымасць стымуляваць асобасную актыўнасць школьнікаў у працы над сабой, сваім маральным развіццём і самавызначэннем.

***Пад педагагічнай падтрымкай працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў мы разумеем працэс узаемадзеяння настаўніка з вучнямі, заснаваны на сумесным выяўленні асобасных маральных характарыстак школьніка і накіраваны на станаўленне яго як маральнага суб'екта жыццядзейнасці.*** Мы не выпадкова выбралі тэрмін «педагагічная падтрымка», а не «педагагічнае ўздзеянне» ці проста «кіраўніцтва», бо любое, нават самае гуманнае ўздзеянне не стасуецца як лінгвістычна, так і педагагічна з паняццем самасці асобы.

Педагагічная падтрымка заключаецца і ў рэалізацыі патрэбнасці дзіцяці ў ацэнцы сваёй асобы, а не толькі прызнанні.

Неабмежаваныя магчымасці ў станаўленні маральнага самавызначэння школьнікаў мае вучэбная дзейнасць.

Працэс маральнага самавызначэння школьніка будзе працякаць паспяхова, калі на ўроку настаўнік будзе пастаянна развіваць здольнасць вучня абмяркоўваць у сваёй

свядомасці свае ўласныя ўчынкі, паводзіны, дзеянні, калі дзіця навучыцца суадносіць іх са сваімі маральнымі каштоўнасцямі. Як вядома, штуршком для любога развіцця з'яўляецца вырашэнне пэўных супярэчнасцей. Працэс маральнага самавызначэння не састаўляе выключэнне. Уменне вучня не толькі бачыць, але і пазітыўна вырашаць канфлікт, супярэчнасці паміж маім асабіста і асабістым другога, маім і агульным, грамадскім указвае на пасяховасць станаўлення дадзенага працэсу.

Даследаванне праблемы маральнага самавызначэння дазволіла нам зрабіць вывады, што эфектыўнасць дадзенага працэсу для малодшых школьнікаў залежыць ад вырашэння наступных задач:

1. Пазнанне сябе праз пазнанне свету (прадметаў, вобразаў, акаляючай рэчаіснасці і г.д.).

2. Не колькасць засваенай інфармацыі ўяўляе каштоўнасць, а праяўленая пры гэтым актыўнасць самога дзіцяці, яго дзейнасць і жаданне пазнаць.

3. Арганізацыя разнастайных відаў дзейнасці для дзіцяці. Прадстаўленне магчымасці праявіць сябе ў індывідуальнай, групавой, калектыўнай працы.

4. Вучыць дзіцяці за кожным відам дзейнасці, заданняў бачыць мэту, умець самаму фармуляваць, ставіць мэту, задачы, прадбачыць і ацэньваць вынікі.

5. Развіццё ўменняў: а) ацэньваць свае ўчынкі. Ацэнка ўчынкаў герояў, вобразаў твораў не будзе прадуктыўнай, станоўчыя паводзіны героя не стануць усвядомленай нормай для пераймання да таго часу, пакуль дзіцяці не навучыцца ўспрымаць, ацэньваць свае ўласныя паводзіны;

б) усведамляць сябе, як адрознага ад іншых, падобнага і адначасова непадобнага на іншае «я», бачыць гэта непадабенства і ўспрымаць як дадзенае;

в) бачыць і ўсведамляць сябе ў моўных зносінах, праз моўныя зносіны (я – гэта мае словы і мае ўчынкі);

г) слухаць (я слухаю – я супастаўляю – я вучуся);

д) выказваць свой пункт погляду і адстойваць яго, нават калі ён зусім не падобны на іншыя.

6. Развіццё індуктыўнай логікі школьніка. Параўнанне, супастаўленне, абагульненне, вызначэнне прычыны – неад'емныя састаўляючыя ўрока.

7. Завучванне вершаў, тэкстаў на памяць школьнікамі мэтазгодна толькі пасля таго, як яны дасканала разбяруцца ў іх змястоўнай сутнасці.

8. Пастаянная падтрымка поспеху ў кожнага вучня, класа ў цэлым.

9. Частае выкарыстанне гульні ў якасці сродка навучання.

Гульня для малодшага школьніка застаецца адным з галоўных відаў дзейнасці і дае магчымасць для больш поўнай самарэалізацыі, праяўлення сваёй індывідуальнасці, вучыць прымаць рашэнні і рабіць выбар.

10. Пастаяннае здзяйсненне педагогам сітуацыйнай рэфлексіі, якая дапаможа развіць у вучняў самасвядомасць, зразумець свае паводзіны.

11. Фарміраванне маральных уяўленняў і паняццяў.

На апошнім пункце хацелася б засяродзіць увагу, як на першасным і важнейшым у плане паступовага станаўлення маральнага самавызначэння вучняў. Правільнае разуменне этычных паняццяў садзейнічае фарміраванню ў школьнікаў маральных матываў паводзін,

умення даваць маральныя ацэнкі з'явам грамадскага жыцця, сваім паводзінам, паводзінам сваіх таварышаў. Маральная свядомасць дзіцяці «разглядае» дзеянні і ўчынкі не з пункту гледжання абумоўленасці, а з пункту гледжання іх каштоўнасці, прадстаўляючы свабоду выбара дзеяння.

Працэс утварэння паняццяў характарызуецца пераходам ад пачуццёвай ступені пазнання да абстрактнага мышлення, пераходам ад адлюстравання свету ў форме адчуванняў, успрыняццяў і яўленняў да адлюстравання яго ў паняццях.

Важную ролю, асабліва для малодшых школьнікаў, у пачуццёвым пазнанні маюць зрокавыя адчуванні. У гэтай сувязі неабходна спалучаць славесную інфармацыю з канцэнтрацыяй увагі дзяцей на ўчынках, дзеяннях старэйшых, аднагодкаў.

Авалоданне маральнымі паняццямі здзяйсняецца паступова. Спачатку вучні слаба аналізуюць паняцці, якія трэба засвоіць, не ўмеюць іх дыферэнцыраваць, абагульняць; потым пасля іх усведамлення паступова пачынаюць даваць абстрактна-лагічнае вызначэнне гэтым паняццям. І ўжо потым яны робяць аналіз гэтага паняцця, абагульняючы, даказваючы. Як вынік – школьнікі не толькі добра ведаюць паняцце, але і могуць ім свабодна карыстацца ў розных сітуацыях. Маральныя паняцці фарміруюцца больш пасляхова, калі яны абапіраюцца на наглядныя ўяўленні.

Добра, калі засваенню маральных паняццяў малодшымі школьнікамі папярэднічае назапашванне неабходных уяўленняў аб розных варыяцыях маральных дзеянняў і ўчынкаў, якіх не абавязкова павінна быць многа, але пажадана, каб яны былі яркімі эмацыянальна, захапляючымі.

Маральныя ўяўленні фарміруюцца непасрэдна ў працэсе прыватнага назірання, дзеяння, апасродкавана яны фарміруюцца пры азнаямленні з літаратурнымі творамі, праглядзе тэлеперадач і г.д. Таму варта на ўроках падбіраць такія творы, знаёміць дзяцей з народнай спадчынай, дзе ў яркіх эмацыянальных фарбах адабраецца ці ганьбіцца той ці іншы ўчынак героя. Але, трэба зазначыць, што для фарміравання маральных паняццяў недастаткова адных уяўленняў. Маральнае паняцце замацоўваец-ца ў працэсе лагічнага суджэння. Таму на ўроках варта засяроджваць ўвагу вучняў на супастаўленні ўчынкаў герояў, рэальных людзей, вылучаць агульныя і адрозныя прыкметы ў іх. Фарміраванне маральных паняццяў патрабуе актыўнай мысленчай дзейнасці вучняў, іх самастойнага падыходу да ўсведамлення і засваення вывучаемых палажэнняў. Гэту праблему вырашаюць такія метадычныя прыёмы, як пастаноўка пытанняў, якія патрабуюць абагульненняў, практыкаванні ў развіцці ўмення даваць вызначэнні, рабіць параўнанні, класіфіцыраваць прадметы і з'явы. Разам з тым, зразумела, што вучні засвойваюць маральныя паняцці глыбей, чым больш узбагачаецца іх адпаведны маральны вопыт.

Для маральнага самавызначэння падлеткаў і старэйшых школьнікаў лічым неабходным вырашэнне наступных задач:

1. Прадстаўленне магчымасцей на ўроку для маральных меркаванняў, супастаўлення.

2. Развіццё пачуцця эмпатыі праз канцэнтрацыю ўвагі ў творах мастацтва, літаратуры, гісторыі, рэальнага жыцця на эпізодах спачування чужому гору, міласэрнасці.

3. З улікам асаблівасцей ўзросу фарміраванне ў вучняў сістэмы маральных каштоўнасцей, арыентаванай на доўгачасовыя задачы, а не на хуткае заахвочванне ці дасягненне малазначнай для перспектывы мэты.

4. Стымуляцыя працэсу развіцця лагічнага мыслення.

5. Развіццё крэатыўнасці. Пры гэтым, неабходна памятаць, што пастаянны ціск з боку дарослых на падлеткаў зніжае ўзровень крэатыўнасці, веры ў сябе.

6. Фарміраванне станоўчай Я – канцэпцыі падлетка праз уключэнне ў пасільныя віды дзейнасці, ацэньванне станоўчых учынкаў, стварэнне добразычлівай атмасферы на ўроку.

7. Строгі ўлік ступені кагнітыўнага развіцця. Разважаць самаму настаўніку з вучнямі патрэбна толькі на тыя тэмы, што даступныя іх свядомасці, узроўню фармальных аперацый, якога яны дасягнулі.

8. Стварэнне праблемных сітуацый, якія дазволяць назіраць, аналізаваць, рабіць вывады.

9. Паўсядзённае выкарыстанне вучэбнага матэрыялу, заданняў, разлічаных на праяўленне актыўнасці і самастойнасці школьнікаў.

10. Адной з важнейшых састаўляючых маральнага самавызначэння з'яўляецца здольнасць прымаць правільныя рашэнні, што ў сваю чаргу залежыць ад таго, наколькі вучні авалодалі логікай разважанняў.

Неабходна памятаць, што нізкая самаацэнка, ціск з боку настаўнікаў, бацькоў, сяброў перашкаджаюць прыняццю самастойных рашэнняў школьнікамі.

11. Фарміраванне адэкватнай асобаснай ідэнтычнасці ў працэсе выбару жыццёвых мэтаў, маральных каштоўнасцей.

12. Шырокае прымяненне актыўных метадаў навучання, ***якія мы вызначаем як спосаб кіравання вучэбна-пазнаваўчай дзейнасцю, што ўключае ў сябе адбор, структурыраванне і перадачу вучэбнай інфармацыі.*** Кіраванне гэтым працэсам можна трактаваць як рэгулюемае ўзаемадзеянне настаўніка і вучня.

Да актыўных метадаў навучання мы адносім толькі тыя, пры якіх вучні знаходзяцца ў пазіцыі актыўнага суб'екта дзейнасці.

Метад актыўнага навучання – гэта сукупнасць арганічна ўзаемазвязаных і ўзаемадзеючых спосабаў арганізацыі вучэбнай працы, якія забяспечваюць дасягненне найбольш высокага ўзроўню вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю ў навучанні і выхаванні ў параўнанні з існуючымі традыцыйнымі спосабамі. Метады актыўнага навучання ў навучальным працэсе мы класіфікуем на неімітацыйныя і імітацыйныя.

| Неімітацыйныя метады | Імітацыйныя метады | |
|---|---|---|
| | Негульнёвыя | Гульнёвыя |
| Праблемная лекцыя, «круглы стол», лекцыя-канферэнцыя, тэматычная дыскусія, дыспут, алімпіяда | Рашэнне маральных сітуацый, рашэнне асобных маральных задач, публічная абарона ідэй, абмеркаванне распрацаваных варыянтаў, індывідуальны трэнінг | Шматварыянтны выбар аптымальнага рашэння, «Мазгавая атака», дзелавыя гульні |

Імітацыйныя віды заняткаў характарызуюцца імітацыяй дзейнасці, актыўнай пазіцыяй вучняў. Такія заняткі надзвычай эфектыўныя. Неімітацыйныя – гэта заняткі, на якіх у недастатковай ступені адлюстроўваюцца творчыя пачаткі, але якія таксама

даюць магчымасць вучню выявіць свае «я», адстаяць сваю маральную пазіцыю. І такія заняткі становяцца актыўнымі, калі яны насычаны самастойнай працай вучняў, выклікаюць неабходнасць папаўнення маральных ведаў, узнімаюць творчую актыўнасць і базіруюцца на прамых і зваротных сувязях.

Маральнае самавызначэнне школьнікаў немагчыма без уключэння вучняў на ўроку ў сістэму рашэння задач маральнага характару. Дзіцяці важна ўжо ў падлеткавым узросце навучыцца дасканала рашаць такія задачы, так як яны пастаянна ўзнікаюць у жыцці чалавека. Рашэнне задач на аснове аналізу канкрэтных маральных сітуацый не супярэчыць тэарэтычнаму навучанню. Канкрэтныя факты, маральныя ўчынкі літаратурных, гістарычных герояў служаць сродкам пазнання маральных каштоўнасцей. Маральная задача служыць вузлом сувязі тэорыі з жыццём, практыкай. Рашэнне задач маральнага характару арыентуе школьніка на дыялектычнае прымяненне маральных законаў, прынцыпаў і правілаў непасрэдна ў жыццёвай практыцы.

Рашэнне задачы маральнага характару абавязкова ўключае ў сябе аналіз зместу маральнай сітуацыі. Гэты аналіз дапускае наступныя этапы:

1. Характарыстыка грамадска-маральнага асяроддзя.
2. Выяўленне аб'ектаў сітуацыі, іх маральная характарыстыка.
3. Характарыстыка адносін маральнай сітуацыі.
4. Фармулёўка маральных праблем (пытанняў).
5. Аналіз маральных рашэнняў і ўчынкаў.
6. Агульная ацэнка вынікаў маральных дзеянняў.

Не прэтэндуючы на беззаганнасць нашага падыходу да гэтай праблемы, мы тым не менш лічым, што працэс рашэння будзе тады максімальна эфектыўны, калі ён уключае ў сябе, з аналізам прапанаванай сітуацыі, асабістае асэнсаванне і складанне задачы маральнага характару вучнем у адпаведнасці з канкрэтна зададзеным алгарытмам. Задачы маральнага характару мы падзяляем на тэарэтычныя і практычныя (інсцэніраваныя, гульнёвыя). Тэарэтычныя задачы не патрабуюць ад навучэнцаў практычных дзеянняў, яны рашаюцца на інтэлектуальным (вербальным) узроўні. Іх годнасць бясспрэчная: высокая эфектыўнасць для развіцця мыслення, большая варыятыўнасць і г.д. Практычныя задачы маюць свае перавагі: яны наглядныя, служаць добрым сродкам фарміравання ўменняў і навыкаў. Па фундаментальнай прыкмеце тэарэтычныя задачы маральнага характару мы падзяляем на:

1. Ілюстратыўныя задачы – дэманстрацыя на канкрэтных прыкладах пазітыўных дзеянняў героя, эфектыўнасці выкарыстаных ім прыёмаў рашэння задачы.

2. Аналітычныя задачы патрабуюць ад вучня навыкаў аналізаваць дзеянні герояў, бачыць у сітуацыі асноўныя і неасноўныя супярэчнасці, разумець структуру сітуацыі. У іх даецца больш-менш падрабязнае апісанне абставін і дзеянняў удзельнікаў сітуацыі.

3. Ацэначныя задачы. Такі тып задач дапамагае фарміраванню ўмення ацэньваць дзеянні ўдзельнікаў маральнай сітуацыі. Ацэньваючы дзеянні гістарычных, літаратурных герояў, школьнік вучыцца аналізаваць факты, выпрацоўваць асабістую пазіцыю.

4. Задачы на выбар эфектыўнага маральнага дзеяння дазваляюць супаставіць магчымыя варыянты, параўнаць іх, выбраць лепшы. У сітуацыях да такіх задач звы-

чайна падбіраюцца розныя дзеянні герояў. Аналізуючы сітуацыю, вучань не абмяжоўваецца ацэнкай гэтых дзеянняў або меркаванняў, а робіць выбар аптымальнга, з яго пункту, маральнага ўчынка.

5. Задачы на прадбачанне ходу разгортвання падзей або іх выніку – яны звычайна фармулююцца на аснове сітуацыі тыпу незакончанай гісторыі, калі апісанне падзей спыняецца дзесьці на кульмінацыйным моманце. Вучань, апынуўшыся «на ростанях», вымушаны сілаю ўяўлення дамаляваць супярэчлівую маральную сітуацыю, уключаючы яе фінал. Каштоўнасць такіх сітуацый заключаецца ў тым, што школьнікі вучацца знаходзіць заканамернасці ў развіцці канкрэтных падзей.

6. Задачы на знаходжанне маральных памылак у дзеяннях герояў.

Тэарэтычнымі задачамі не вычэрпваецца ўвесь клас задач маральнага характару. Вялікае значэнне ў станаўленні маральнага самавызначэння школьнікаў выконваюць практычныя задачы або сітуацыі-практыкаванні. Яны дапускаюць выкананне і абгрунтаванне вучнямі сваіх дзеянняў у магчымай сітуацыі, гэта значыць вырашэнне іх не на вярбальным узроўні, а на дзейнасным, іншымі словамі: практычныя задачы мадэліруюць магчымую маральную сітуацыю, у якой можа аказацца вучань. Пры гэтым сітуацыя развіваецца не па загадзя распрацаванаму сцэнарыю, а пры дапамозе экспромтных дзеянняў яе ўдзельнікаў, якія выбіраюць тую ці іншую лінію паводзін у залежнасці ад рэакцыі і маральнай пазіцыі партнераў.

Для вырашэння праблемы маральнага самавызначэння школьнікаў надзвычай важна наладжванне адваротнай сувязі паміж настаўнікам і вучнямі. Гэта дапаможа педагогу ўбачыць, наколькі паведамляемая інфармацыя ўспрынята вучнем, як школьнік самастойна ўмее аналізаваць і мысліць, выбіраць і абгрунтоўваць.

Падводзячы вынік, зазначым, што праблема станаўлення маральнага самавызначэння школьнікаў надзвычай актуальная, асабліва для сённяшняга часу. Перад школай стаіць задача выхавання чалавека самастойнага, ініцыятыўнага, здольнага прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць. Рыхтавацца да вырашэння гэтай праблемы будучыя настаўнікі павінны ўжо ў час навучання ва універсітэце.

## Літаратура

1. *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў 5 т.* Мн. Т. 5. Кн. 1. С. 36.
2. ***Красиков В.И.*** Метафизика самоопределения. Кемерово, 1995.С. 33.
3. ***Платон (Игумнов).*** Православное нравственное богословие. М., 1994. 240 с.
4. ***Зотов Н.Д.*** Нравственное самоопределение личности. Знание, 1983. С. 45.
5. ***Валеев Д.Ж.*** Моральное самоопределение личности как показатель эффективности нравственного воспитания // Проблемы коммунистического воспитания студентов. Уфа, 1982. С. 129-133.
6. ***Абульханова-Славская К.А.*** Стратегия жизни. М., 1991. С. 70.
7. ***Психология. Словарь / Под ред. А.В. Петровского, М.Г. Ярошевского.*** – 2-е изд., исп. и доп. М., 1990. С. 351.
8. ***Кон И.С.*** В поисках себя: Личность и ее самосознание. М., 1984. С. 207.

9. ***Сафин В.Ф.*** Психология самоопределения личности: Учебное пособие. 1986. – 142 с.

10. ***Степанов С.С.*** Психологический словарь для родителей. М., 1996.

11. ***Слабодчиков В.И., Исаев Е.И.*** Антропологический принцип в психологии развития // Вопросы психологии, 1998, № 6. С. 3-17.

12. ***Гинсбург М.Р.*** Личностное самоопределение как педагогическая проблема // Вопросы психологии. 1988. № 2.

13. ***Божович Л.И.*** Личность и ее формирование в детском возрасте: Психологическое исследование. М., 1968. – 468 с.

14. ***Пашкевіч У.В.*** Педагагічныя аспекты праблемы маральнага самавызначэння школьнікаў // Веснік ВДУ, 2000,. № 3 (17). С. 18-24.

15. ***Цветкова Р.И.*** Психологическая характеристика нравственных ценностей подростков // Психологические аспекты формирования нравственных ценностей у школьников. Хабаровск, 1985. С. 8.

16. ***Иващенко А.В.*** Нравственное самовоспитание старшеклассников. Мн., 1974. С. 18.

17. ***Маслоу А.*** Психология бытия. М., 1997. – 304 с.

УДК 37.013.42

# Экскурс в проблему социализации молодежи: педагогический аспект

**Ю.М. Прохоров**

Процесс социального развития человека, включение его в мир общественных отношений стал с конца XIX века обозначаться термином «социализация» (Г. Тард, Ф. Гиддингс). Одним из основоположников, занимающихся изучением социализации как предмета социально-педагогических исследований, был немецкий философ и педагог Пауль Наторп. Он ставил в центр своей социально-педагогической концепции «свободное самовоспитание в общности жизни взрослых», подчеркивая, что человек не формируется как отдельная единица общества, сам по себе. Наторп считал, что в реальной жизни человека делает человеком общность с другими людьми, благодаря сотрудничеству и «психическим отношениям». Решающую роль он отводил воле, считая ее практическим познанием. По его мнению, благодаря воле, несовершенный человек способен к самосовершенствованию, и именно воля является определяющим фактором личностного развития. Со степенью развития воли он связывал и ступени активности личности, ее нравственность как главную добродетель, а также добродетели в сфере разума – истины, влечений – меры и справедливость как социальную добродетель. В середине XX века термин «социализация» получил официальный статус теоретическо-